возможностях обогащения собственных научных знаний, которые они передавали белорусским студентам в процессе обучения. Так у новых поколений формировалась современная картина мира, в которой было место и актуальным историческим оценкам, и новому знанию о зарубежной действительности. Белорусский государственный университет приобретал статус полноправного участника международной жизни независимой республики.

## Библиографические ссылки

1. Толстик, И.А. Пресса Германии на рубеже XX–XXI вв. – Минск: БГУ, 2004. – 299 с.

**Яноўскі Алег Антонавіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# УНІВЕРСІТЭЦКІЯ ЮБІЛЕІ: ЧАС ПАДВЕСЦІ ВЫНІКІ І ВЫЗНАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Сэнс нашай канферэнцыі, тэматычнае напаўненні яе назвы дазваляюць і нават патрабуюць звярнуцца да застарэлага пытання: калі ж усё-такі дакладна быў створаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, чаму менавіта 30 кастрычніка 1921 г. прынята лічыць «кропкай адліку» яго гісторыі? Нам вельмі хацелася б мець абсалютна доказальную дату яго «нараджэння». Дату, якая б задавальняла ўсіх – і перакананых у дакладнасці існуючай, і скептыкаў, якіх і раней, і сёння заўсёды хапала нават сярод дасведчаных універсітэцкіх інтэлектуалаў.

Чамусці раз-пораз карціць замяніць 30 кастрычніка 1921 г. – дзень абвяшчэння распачынання рэгулярных вучэбных заняткаў ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях – на 25 лютага 1919 г., калі ЦВК ССРБ выдаў дэкрэт аб неабходнасці стварэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску. І нават ёсць фіксацыі пачатку дзейнасці БДУ пад датай 18 красавіка 1921 г.: у гэты дзень ЦВК як бы той жа ССРБ, але істотна змяніўшайся за кароткі час і па тэрытарыяльнаму складу, і па складу вышэйшага кіраўніцтва, падцвердзіў «ранее изданные постановления об открытии в гор. Минске Белорусского государственного университета» [1, арк. 3]. А то нават можна прачытаць «аргументы» аб неабходнасці ўзнавіць дату 11 ліпеня 1921 г. у якасці найважнейшай: у гэты дзень упершыню адбыўся публічны Ганаровы акт адкрыцця БДУ, прымеркаваны да першай гадавіны вызвалення Мінска ад польскіх акупацыйных войск. Свая логіка існуе ў дачыненні да кожнай з гэтых дат, хаця пры больш-менш уважлівым падыходзе можна вызначыць яшчэ некалькі знамянальных падзей, якія суправаджалі складаны шлях стварэння першага класічнага беларускага ўніверсітэта – хаця б прымаючы да ўвагі іншыя «лёсавызначальныя» рашэнні, якія са жніўня 1920 г. па верасень 1921 г. зыходзілі ад урада ССРБ ці нават дакладна ад двух урадавых Камісій (Мінскай і Маскоўскай) садзейнічання стварэнню БДУ Аб гэтым напісана нямала, а таму аргументаваць важнасць амаль што кожнага рашэння няма патрэбы.

Кожны крок, які ў 1919–1921 гг. рабіўся насустрач універсітэту, мае гістарычную важкасць, не павінен быць астаўлены па-за ўвагай. Вось толькі сёння мы «в суете буден» і з нагоды надыходзячага чарговага «круглага» юбілею часам імкнемся парушыць даўно ўсталяваную традыцыю адзначаць дзень нараджэння нашага БДУ толькі і не інакш як пад датай 30 кастрычніка 1921 г. Патрэбна сказаць, абапіраючыся на свой шматгадовы вопыт дачынення да ўніверсітэцкіх юбілеяў, так было не аднойчы і ў 1970–2000-я гады. Між тым доказ наконт традыцыйнага падыходу вельмі просты – так вырашылі нашы інтэлектуальныя прашчуры. І яны з гонарам з году ў год рыхтавалі святкаванні не толькі «круглых» дат, зыходзячы менавіта з 30 кастрычніка. Яны імкнуліся з нагоды тых ці іншых падзей у жыцці ўніверсітэта і ўсёй Беларусі дэманстраваць беларусам, грамадству вызначальную вартасць, першаснасць БДУ для адукацыйна-навуковай сферы, створанай якраз пры непасрэдным уплыве першага беларускага ўніверсітэта. Нездарма ў рэшце рэшт гэтая дата была зафіксаваная ў Статуце ўніверсітэта, які быў зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 16 чэрвеня 1999 г. Літаральна першы пункт Указа фіксаваў: «Университет основан 30 октября 1921 г.» [2, с. 5]. Праўда, у наступных (24.09.2001 г., 07.05.2003 г., 14.06.2004 г., 25.09.2006 г., 30.09.2011 г.) рэдакцыях Статуту было ўнесена ўдакладненне: БДУ створаны «по решению Президиума ЦИК БССР от 18 апреля 1921 г. № 64 и открытый 30 октября 1921 г...» [3]. Але гэтае ўдакладненне толькі прымушае ўсіх нас не забываць тое, што шлях да распачынання сапраўднай дзейнасці БДУ быў і доўгім, і цяжкім, а вызначэнне яго дзяржаўнага статусу адбылося на самым высокім дзяржаўнам узроўні. І насамрэч універсітэт быў «открытый 30 октября 1921 г.».

Нам толькі застаецца працягваць традыцыю і адначасова ўсё глыбей і глыбей пасцігаць як складанейшыя пертурбацыі, якія з 25 лютага 1919 г. па 30 кастрычніка 1921 г. суправаджалі рэалізацыю ідэі БДУ, так і веліч і трагедыі многіх наступных дзесяцігоддзяў яго дзейнасці. Увогуле, знешне гісторыя БДУ як бы добра даследаваная, але пры паглыбленым аналізе шматлікіх выданняў і існуючых яшчэ нераспрацаваных крыніц можна канстатаваць: нават напярэдадні стогадовага юбілею мы маем відавочныя інфарматыўныя і тэматычныя лакуны.

Нават тэма ўніверсітэцкіх юбілеяў (як яны рыхтаваліся і адзначаліся, якія высновы рабіліся з іх нагоды і інш.) пакуль што не разглядалася як навуковая праблема. Між тым якраз падзеі юбілейных мерапрыемстваў дастаткова добра зафіксаваныя ў крыніцах рознага паходжання. У іх у канцэнтраваным выглядзе захавалася многае з таго, што цяжка абагуліць на падставе прачытання дакументаў аб будзённым, рабочым, бягучым жыцці і ўсяго ўніверсітэту, і яго асобных структур, і выкладчыкаў ды студэнтаў.

Ужо першая і другая гадавіны дзейнасці БДУ былі шырока адзначаныя першым складам прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў і студэнтаў. Важна тое, што святкаванні адразу сталі ладзіцца на ўрадавым узроўні, з агульнадзяржаўным агучваннем. Так, на «Годичный акт Бел. Гос. Университета 30 октября 1923 года» сярод соцен запрошаных

гасцей былі 7 членаў ЦВК ССРБ на чале са старшынёй А. Р. Чарвяковым і сакратаром А. О. Сташэўскім, каля 10 наркамаў ад СНК, вышэйшыя ваенныя, пракурорскія і судовыя чыны, гарадское чыноўніцтва і інш. [4, арк. 3]. Патрэбна адзначыць, што юбілейныя даты не заставаліся па-за ўвагай беларусаў замежжа, якія станоўча ацэньвалі якраз у першую чаргу поспехі савецкіх суайчыннікаў у галіне адукацыі і навукі. У Польшчы, Літве, Латвіі і іншых краінах безумоўна дзень нараджэння БДУ ўспрымаўся пад датай 30 кастрычніка 1921 г., бо з гэтага моманту ўніверсітэт распачаў сваё натуральнае жыццё. Весці гаворку пра нейкую іншую дату не было аніякага імкнення. У якасці такой «не-савецкім» беларусам было складана ацэньваць «броўнскі рух» памкненняў, меркаванняў, спрэчак, які распачаўся вакол ідэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пасля аглашэння дэкрэта ЦВК ССРБ 25 лютага 1919 г. А тым больш абсалютна палітычна заангажаванай падавалася дата 11 ліпеня 1921 г. (хаця ў Беларусі 1920–1930-х гг. яе не аднойчы імкнуліся процівапастаўляць 30-му кастрычніка).

Характэрнай ілюстрацыяй успрыняцця беларусамі замежжа гісторыі і сутнасці БДУ можна назваць верш з груваздкай назвай «На 5-ці угодкі істнаваньня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску. Кастрычнік 1921 г. – Кастрычнік 1926 г.», які быў надрукаваны на першых трох старонках ковенскага часопіса «Покліч». Ён дастаткова графаманскі, хаця і бачна імкненне аўтара трымацца рытму старажытных былін. Але ў цэлым гэты верш выразіў шчырае захапленне поспехамі калектыву БДУ, нават пэўную зайздрасць. Галоўнае ж тое, што аўтар выказвае надзею на далейшы росквіт роднай Беларусі з непасрэдным уплывам універсітэта: «Пяць гадоў таму маяк веданьня засвяціў–зазьяў над Нямігаю; да сябе маніць навук промнямі і надзеі лье ў сэрцы моладзі...» [5, с. 1].

Так сталася, што першы «круглы» юбілей універсітэта супаў з 25 годдзем навуковай і педагагічнай дзейнасці яго рэктара. І ён быў адзначаны не толькі шырока і гучна, але з відавочным акцэнтам на прапаганду велічы БДУ ў распрацціранні інтэлектуальнасці і высокай прафесійнасці насуперак элементарнай непісьменнасці і цемрашальству. Прыклад поспехаў калектыву ўніверсітэта на чале з выдатным навукоўцам-рэктарам павінен быў даведзены да ўсіх у якасці жыццёвых арыентыраў. Аб БДУ і У. І. Пічэце ў кастрычніку 1926 г. амаль штодзённа падавалі featuresнабаковыя матэрыялы ўсе сродкі масавай інфармацыі БССР. Вяршыняй такой ва ўсіх адносінах пазітыўнай кампаніі стала наданне Уладзіміру Іванавічу адмысловай пастановай № 16 Наркамата асветы рэспублікі ад 30 кастрычніка «ганаровага стану заслужанага прафесара Беларускае Савецкае Соцыялістычнае Рэспублікі». Цікавая дэталь: гэтую пастанову, як і самі юбілейныя мерапрыемствы пад датай 30 кастрычніка, ініцыіравала рашэнне «закрытага пасяджэння» Бюро ЦК КП(б)Б [6, арк. 22; 7, арк. 94]. Так што гэты дзень станавіўся ўвасабленнем самых высокіх дасягненняў ў жыцці маладой краіны, яе інстытуцый і яе выбітных людзей.

Да юбілею грунтоўна рыхтавалася ўся краіна. На дзяржаўным узроўні быў зацверджаны «Асноўны матар'ял да сьвяткаваньня 5-гадовага юбілею Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту», у якім праз

19 пунктаў праводзілася як бы мікрадаследаванне зробленага і адначасова рабілася гучная справаздача па ўзаемазвязаных, важных накірунках: 1) адукацыйны стан, які дастаўся з нядаўняга гістарычнага мінулага; 2) унёскі БДУ ў распрасціранне па ўсёй Беларусі асветы, навукі, культуры (4 ВНУ, 23 тэхнікумы, 36 прафшкол, 3 навуковыя ўстановы, 3 тэатры, Дзяржвыдавецтва і інш.); 3) перспектывы развіцця сістэмы адукацыі БССР аж да пачатку 1940-х гг. [8, арк. 21–22]. Галоўнае, што названыя дасягненні як бы напрасткі падаваліся ў рэчышчы БДУ – як цесна звязаныя з плёнам пяцігадовай яго дзейнасці.

У гэтай сувязі можна было б згадаць шмат прыкладаў: універсітэт у беларускім грамадстве ўвасабляў вяршыню, да якой павінны імкнуцца і чалавек, і самыя розныя сферы і інстытуцыі маладой краіны. Таму натуральна, што ўніверсітэцкія святочныя гадавіны пашыраліся, бо яны давалі магчымасць аглянуцца назад, асэнсаваць шляхі далейшай дзейнасці. Сутнасныя характарыстыкі БДУ, вынікі работы, планы на бліжэйшую і далёкую перспектыву пастаянна агучваліся з рознай знамянальнай нагоды: першага выпуску ў 1925 г. першых 60 падрыхтаваных спецыялістаў – юрыстаў і эканамістаў; у наступным 1926 г. – першага выпуску першых 160 медыкаў (як і многіх дзесяткаў першых педагогаў і спецыялістаў іншых накірункаў ведаў). Так, сярод іншага, 20 лютага 1925 г. у сваім прывітанні першаму выпуску факультэта грамадскіх навук ад імя ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР Усевалад Ігнатоўскі згадаў, што калі ў 1919 г. толькі «працавалі над яго (БДУ – *А. Я.*) праграмай і пытаньнямі яго арганізацыі», то менавіта «з 21 году пачалася праца» БДУ. Праца ў вельмі цяжкіх эканамічных умовах, у якіх спасціжэнне вяршынь ведаў, па словах Уладзіміра Пічэты, можна прыраўняць да подзвігу. Між тым тады было відавочным, што пераадоленне цяжкасцяў толькі пачыналася, а выпускнікоў наперадзе чакаў «труднейший из факультетов – факультет жизни», як са свайго боку ўніверсітэцкіх выхаванцаў і натхняў, і папярэджваў прафесар Сямён Вальфсон [9, с. 16, 20, 21]. Падобныя думкі выказваліся ўніверсітэцкімі інтэлектуаламі і на «надзвычайным пасяджэньні» Праўлення БДУ з нагоды першага ўзбуйнення Беларусі, якое адбылося трыма днямі раней (17 лютага 1925 г.) за вышэйазначанае мерапрыемства.

Па-сапраўднаму эпахальна ўніверсітэт адзначаў дзесяцігоддзе кастрычніцкай рэвалюцыі. Былі шматлікія звароты да гісторыі і краіны, і БДУ. Аналізавалася зробленае, не саромеліся гаварыць пра дасягненні, але больш акцэнтавалі ўвагу на праблемах і перспектывах далейшай дзейнасці. У спецыяльным зборніку, падрыхтаваным універсітэтам да гэтай важнай у жыцці ўсяго Саюзу рэспублік падзеі, рэктар У. І. Пічэта дакладна размяжаваў тры важныя даты пачатковай гісторыі БДУ. З лютага 1919 г. распачалася арганізацыйная, падрыхтоўчая праца, якая «была скончана ў пачатку красавіка 1921 году», калі 3-я сесія ЦВК ССРБ пастанавіла «аднавіць праэкт адчыненьня ў Менску Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту». Потым, «11 ліпеня 1921 году, у дзень вызваленьня гораду Менску ад палякаў, адбылося ўрачыстае пасяджэньне, ... і быў агалошаны дэкрэт Ураду аб адчыненьні Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту». Але толькі «30 кастрычніка 1921 году адбылося фактычнае адчыненьне» універсітэта [10, с. 6, 7, 17].

Імкненне кіраўніцтва і ўсяго калектыву БДУ раўняць сябе пад агульнадзяржаўныя маштабы планаў і перспектыў асабліва праявілася ў тэкстах зборніка, выпушчанага дзяржкамісіяй, якая рыхтавала і праводзіла святкаванне дзесяцігоддзя дзейнасці ўніверсітэта. Характэрныя дзве акалічнасці можна адзначыць у ідэялагемах гэтага святкавання. Па-першае, урадавая камісія была прызначана правесці ўшанаванне дзесяцігоддзя не толькі БДУ, а ўсёй вышэйшай школы БССР. Тым самым за ўніверсітэтам падкрэслівалася выключная першаснасць распачынання вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Па-другое, ва ўмовах нарастаючага абвастрэння супрацьстаяння з «панскай Польшчай» зноў юбілей БДУ прымеркавалі да 11 ліпеня 1921 г. (каб у каторы раз акцэнтаваць знакавасць двух падзей у жыцці беларусаў, а яшчэ больш – для натхнення іх, асабліва моладзі, на адпор любому ворагу). Пэўны ідэялагічна-метафарычны кантэкст святкавання пад такой датай прагучаў у прывітальным слове калег з Казанскага ўніверсітэта: «Белорусский Университет, стоящий на границе Советских Союзных Республик и буржуазной враждебной нам Польши, будет тем непосредственным рассадником свободных научных истин и научных завоеваний, которые в первую очередь будут бить буржуазный мир и проникать в его толщу. С этой точки зрения Белорусский Университет поистине является тем стражем, который будет распространять новые мысли и новые идеи социализма и коммунизма вокруг себя» [11, арк. 9].

Тэксты афіцыйных асоб – наркама асветы Антона Платуна і новага ўніверсітэцкага рэктара Язэпа Каранеўскага – у першых радках згадвалі гэтую дату. Але без абгрунтаванняў і асаблівага імпэту. Іншыя аўтары (дэканы і прафесура БДУ) зусім яе не датыкаліся. Галоўнай тэмай для ўсіх было, калі зыходзіць з сэнсу артыкула наркама А. Платуна, – «10 год існаваньня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту як першай вышэйшай школы ў БССР» [12, с. 3].

Усяго толькі праз пяць гадоў чарговае юбілейнае святкаванне раптам было перанесена аж на студзень 1937 г. (можа, занадта непрадсказальным быў час? – *А. Я.*). Між тым не былі забыты і непасрэдна сам «юбілейны дзень»: напярэдадні 30 кастрычніка 1936 г. ў рамках падрыхтоўкі да святочных мерапрыемстваў 150 студэнтаў, адзетыя ў касцюмы народаў СССР, прадэманстравалі «згуртаванасць народаў Саюза вакол любімага правадыра Сталіна, а таксама культурны рост БССР» [13].

Увесь комплекс юбілейных мерапрыемстваў, як і раней, рыхтавала адмысловая ўрадавая камісія. Яна намеціла іх цэлы шэраг. Сярод іншых цэнтральным павінна была стаць чатырохдзённая навуковая сесія. Перад БДУ напрамую ставілася задача прадэманстраваць «асабліва дасягненні ў навукова-даследчай рабоце» [14]. Патрэбна сказаць, што тады ішла «барацьба» за новы пад'ём у навуцы, паўсямесна (нават у рэкламных публікацыях з нагоды разгортвання новай уступнай кампаніі) рэфрэнам праводзілася думка пра тое, што ўніверсітэт заўсёды быў слаўны навукай. Патрэбна было толькі лозунгавыя канстатацыі пераканаўча падцвярджаць аналізам работы факультэтаў з падрабязным асвятленнем падрыхтоўкі менавіта «навуковых кадраў». Што дастаткова пераканаўча рабілася [15].

У арганізацыі юбілею «адчувалася рука» былога рэктара Ананія Іванавіча Дзякава, які з верасня 1935 г., пакінуўшы ўніверсітэт, спачатку ўзначаліў аддзел культуры і асветы ЦК КП(б)Б, а 17 красавіка 1936 г. быў прызначаны наркамам асветы БССР [16, арк. 86]. У гэтыя ж красавіцкія дні ўніверсітэтам стаў кіраваць чарговы (пяты па ліку) рэктар – Аляксей Сцяпанавіч Кучынскі (праўда, з прыстаўкай «врид»). Яму прыйшлося з нагоды юбілейнага года 25 мая 1936 г. прадэманстраваць поспехі БДУ перад сакратаром ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікала, які спецыяльна наведаў універсітэт. На час падрыхтоўкі да святкаванняў у БДУ на вочным і завочным аддзяленнях навучалася каля 1, 5 тыс. студэнтаў [17, с. 63]. Гэта значыць, універсітэт ледзьве-ледзьве набліжаўся да сваіх памераў кастрычніка 1921 года...

На 15 студзеня 1937 г. меркавалася правесці «урачысты юбілейны сход» з удзелам партыйна-урадавай эліты, прадстаўнікой ВНУ, навуковых устаноў, грамадскіх арганізацый і іншых гасцей. Ён павінен быў стаць завяршальным акордам у шэрагу навуковых мерапрыемстваў, разгарнутай прапагандысцкай кампаніі, мэтай якой было паўсямесна падкрэсліць карэнныя адрозненні «савецкага ўніверсітэта» ад іншых. Сярод розных планаў матэрыяльна-тэхнічнага кшталту (закупка імпартнага навуковага абсталявання, будаўніцтва кватэр для выкладчыкаў, правядзенне рамонту будынкаў і інш.) выдзялялася ўказанне прафесару С. Я. Вальфсону напісаць нарыс па гісторыі БДУ, а рэдагаваць павінен быў сам наркам А. І. Дзякаў. Таксама было вызначана выдаць юбілейны зборнік навуковых прац. Яго падрыхтоўка ўскладвалася на рэдкалегію з двух акадэмікаў – гісторыка Васіля Шчарбакова і матэматыка Цэлесціна Бурстына, трох прафесараў – хіміка Мікалая Ярмоленка, біёлага Ціхана Годнева, фізіка Яўгена Сняткова, а таксама выконваючага абавязкі рэктара эканаміста Аляксея Кучынскага. Але надыйшоў 1937 год, які скасаваў і планы, і многіх іх выканаўцаў. Так, рэктара арыштавалі 7 лютага 1937 г, і ўжо новы «врид» рэктара хімік М. Ф. Ярмоленка бадзёра, але будзённа рапартаваў пра поспехі і аб «выніках першага паўгоддзя» юбілейнага года [18].

Наступны, двадцацігадовы юбілей БДУ, прыпаў на час, калі подых, надыход вялікай вайны адчувалі ўсе. На канец 1930-х – пачатак 1940-х гг. яшчэ больш актуалізавалася і дасягнула абсалютных памераў антыпольская рыторыка, якая ахапіла ўсе прыступкі ўлады і ўсе катэгорыі насельніцтва. Таму не дзіўна, што нават «круглаю» гадавіну БДУ ўрадавыя колы вырашылі адзначаць не толькі шырока, гучна, на працягу шмат часу, але і менавіта ў антыпольскай абалонцы. Спецыяльным рашэннем ЦК КП(б)Б ад 14 лістапада 1940 г. было вызначана-прадпісана, што «Беларускі Дзяржаўны Універсітэт у 1941 годзе... святкуе 20-гадовы юбілей свайго існавання». І быў прызначаны дзень святкавання – 11 ліпеня. Сваё абгрунтаванне гэтай даты ў хуткім часе (6 снежня) прадставілі ў адмысловым пісьме, накіраваным на імя старшыні СНК БССР Івана Былінскага, старшыня юбілейнай камісіі і наркам асветы Еўдакія Уралава разам з рэктарам БДУ Парфёнам Савіцкім [19, арк. 9–11]. Яны ў рэчышчы палітычнага моманту канстатавалі, што «Універсітэт снован дэкрэтам В. І. Леніна ў 1921 годзе 11 ліпеня ў дзень першай гадавіны аслабанення БССР ад

белапольскай акупацыі». Але пасля такога палітычна заангажаванага сведчання далі дакладную і аб'ектыўную карціну зробленага ўніверсітэтам за 20 гадоў, ягонае месца ў адукацыйна-культурнай сферы рэспублікі: «Універсітэт з'яўляецца першым вузам у БССР... Такія інстытуты, як Медыцынскі, Педагагічны, Юрыдычны, Палітэхнічны, Народнай гаспадаркі – гэта ўсё быўшыя факультэты Універсітэта... За дваццаць год свайго існавання Універсітэт падрыхтаваў звыш 6000 высокакваліфікаваных спецыялістаў..., а таксама праз аспірантуру падрыхтаваў звыш 150 чалавек спецыялістаў для вузаў і навукова-даследчых інстытутаў...». Напрыканцы кіраўнікі Камісіі сціпла папрасілі ўрад рэспублікі выдзеліць з нагоды юбілею пэўныя грошы на падтрымку матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта, на прэміраванне лепшых яго работнікаў.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваліся іншыя цікавыя дакументы – сведчанні ўважлівай ўвагі прадстаўнікоў розных колаў Беларусі да знамянальнай даты ў жыцці ўсёй рэспублікі, а не толькі калектыву БДУ. Напрыклад, юбілейная камісія распрацавала дэталёвы «Календарный план работы по подготовке к двадцатилетнему юбилею БГУ». У ім вызначаліся агульныя і дакладныя дзеянні, якія неабходна ажыццявіць, каб падзея была адзначана самым належным чынам. Адзначым, што не ставілася задача падрыхтаваць спецыяльную кнігу аб БДУ (можа таму, што усе папярэднія спробы яе напісаць правальваліся). Але планавался вялікая выстава «всех изданий БГУ и работ отдельных работников Университета», як і выстава «БГУ за двадцать лет». Зусім палітычна вывеоанай было прадстаўленне дзейнасці ўніверсітэцкай партарганізацыі за 20 год. А вось «Воспоминания» акадэміка У. М. Перцава, падрыхтаваныя да юбілейнай даты, можна расцэньваць як даніну памяці тых, з кім гісторыку прыйшлося будаваць БДУ. Праўда, якраз імёны (за выключэннем трох) і не былі названыя (мабыць, у сілу атрыманага за 1930-я гады жыццёвага і палітычнага вопыту – А. Я.). Але цеплыня да ўніверсітэту і гонар за яго гучаць у кожным радку. Да слова, – Уладзімір Мікалаевіч ускосна падцвердзіў, што на пачатак кастрычніка 1921 г. універсітэт знаходзіўся «в самой начальной стадии своей организации». А таму адносіць яго «арганізацыю» да 11 ліпеня няма аніякіх падстаў [19, арк. 74–97, 99].

Намечаныя на чэрвень–ліпень 1941 г. юбілейныя мерапрыемствы абарвала вайна...

Пасля Перамогі над фашызмам калектыў БДУ не толькі праяўляў імкненне да як мага хутчэйшага аднаўлення ўсіх сваіх страчаных кандыцый, але з рознай нагоды гучна заяўляў аб сабе, прадстаўляў грамадскасці і былыя дасягненні, і бягучыя. Так, да 30-годдзя БССР рэктар Уладзімір Тамашэвіч выступіў у газеце «Советская Белоруссия» з падсумаваннем зробленага ўніверсітэтам у імя краіны і народа. Ён ізноў, як гэта ўзнавілася напярэдадні вайны, вытокі ўніверсітэцкай гісторыі прыцягнуў да 11 ліпеня 1921 г. [20]. Надалей для гісторыі БДУ «антыпольскі складнік» стаў як палітычна не актуальным, так і штучным па сэнсу – аб'ектыўна зафіксаваная, традыцыйная дата 30 кастрычніка 1921 г. канчаткова была ўзятая за кропку адліку. З пачатку 1950-х гг. пад яе ладзіліся чарговыя юбілеі, было прынята рашэнне аб сбору ўсёй

магчымай інфармацыі, дакументаў па гісторыі першага беларускага ўніверсітэта, было задумана стварыць музей гісторыі БДУ (экспазіцыйны матэрыял збіралі, апрацоўвалі, рыхтавалі тэксты маладыя выкладчыкі кафедры гісторыі СССР Марыя Фрыдман і Ядвіга Навуменка) [21, с. 135].

Але зноў канчатковы выдавецкі вынік не быў дасягнуты. Праўда, праз некалькі гадоў гэтая праца нарэшце знайшла сваё ўвасабленне ў першай грунтоўнай кнізе пра БДУ – «Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина». Яна была падрыхтаваная да друку летам 1961 г., хаця пабачыла свет толькі у пачатку 1962 г. [22]. У якасці тых, хто, як было напісана на апошняй старонцы выдання, «принимал участие в подготовке текста» дастаткова невялікай кнігі (каля 300 старонак), пазначаны аж 32 асобы. Большасць з іх – кіраўнікі ўніверсітэта рознага рангу: ад прарэктараў і дэканаў да загадчыкаў кафедрамі і «простых» прафесараў. Як можна меркаваць, асноўную аўтарскую нагрузку вынеслі прадстаўнікі гістфака: ужо названыя М. Б. Фрыдман і Я. П. Навуменка, а таксама Л. С. Абэцэдарскі, А. І. Сідарэнка, Л. М. Шнеерсон. Гэтая кніга была ўзятая за ўзор пры падрыхтоўцы наступнага, вельмі «круглага» юбілею, – 50-годдзя БДУ [23].

У наступным часе традыцыя адзначаць знакавыя даты ў гісторыі БДУ выданнем разнастайнай літаратуры толькі мацнела. Галоўнае ж тое, што юбілеі ўніверсітэта загадзя і вельмі карпатліва рыхтаваліся, праводзіліся заўсёды на дзяржаўным узроўні. Адно толькі тое, што святочныя пасяджэнні праходзілі ў самых прэстыжных будынках г. Мінска (некалькі разоў яны ладзіліся ў Палацы спорту і Вялікім тэатры оперы і балета) з удзелам прадстаўнікоў ураду і шырокіх колаў грамадства рэспублікі, адлюстроўвала важнасць падзеі для ўсёй Беларусі. Свята дазваляла калектыву ўніверсітэта азірнуцца назад, узгадаць выдатныя старонкі гісторыі сваёй alma mater, падвесці вынікі дзейнасці за пэўны папярэдні час, а адначасова вызначыць стратэгію развіцця на бліжэйшую перспектыву. Такім чынам, у юбілеях у сінтэтычнай гармоніі спалучаліся мінулае, сучаснае і будучае БДУ. І такая традыцыя, амаль без выключэння, падтрымлівалася на працягу, без малога, стагоддзя яго дзейнасці ў імя адукацыі, навукі, грамадства, краіны.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф 6. Воп. 1. Спр. 6.
2. Устав Белорусского государственного университета. – Минск: Изд. Центр БГУ, 1999. – 24 с.
3. Устав Белорусского государственного университета // (Электронный ресурс) https://docplayer.ru/39200063-Ustav-belorusskogo-gosudarstvennogo universiteta.html. – Время доступа: 18.03.2019 г.
4. НАРБ. Ф. 205. Воп. 12. Спр. 3.
5. Палын А. На 5-ці угодкі істнаваньня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску. Кастрычнік 1921 г. – Кастрычнік 1926 г. // Покліч. Беларуская грамадзкая часопісь. – Коўна, 1926. – № 6 (8).
6. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 6335.
7. НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 3. Спр. 19.
8. НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 313.